дарственую машыну, злучаць на гэтым грунце ўсе жывыя, чынныя элемэнты і асаблівы націск рабіць на культурна–нацыянальную работу.

Мы лічым сваей павіннасьцю асобна затрымацца над справай культурна–нацыянальнай работы — не затым, каб тлумачыць вагу яе наагул, бо гэта кожнаму ясна, але затым, каб паказаць значэньне яе з палітычнага пагляду. Дагэтуль усе гасударственыя ўстановы ў Беларусі, усе ўрады, школы і т. п. мелі чыста расейскі характар: усюды панавала маскоўшчына, а гэта прыдавала і ўсяму краю маскоўскі характар. І няволя Беларусі выяўлялася ня толькі ў падчыненьні маскоўскім царом, ня толькі ў прыналежнасьці да расейскай дзяржавы, але і ў тым, што маскоўшчына лішне глыбока ўелася ва ўсё нашае жыцьцё. Устаўная Грамата Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з 25 марца с. г. кажа, што апавяшчэньнем незалежнасьці Беларусі „скідаецца *апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці*“. Але, папраўдзе, ярмо гэтае — не апошняе: яшчэ і дагэтуль мы бачым насьледкі *культурнай залежнасьці* ад маскалёў, тэй залежнасьці, якая выгнала зусюль нашу родную мову, спыніла разьвіцьцё нашае нацыянальнае культуры і прымусіла нас карміцца тым, што стварылі маскалі, а часьцю палякі. Болей таго: усе нашы творчыя сілы ішлі на службу чужынцам і памагалі ім у іх культурнай працы, якая на нашай зямлі кіравалася да поўнага зьніштажэньня беларускага народу. І вось, калі мы гаворым аб поўным вызваленьні нашае Бацькаўшчыны ад чужацкага панаваньня, калі наша ладжаная дзяржаўнасьць мае быць папраўдзе *беларускай,* дык яна павінна быць збудована на беларускім нацыянальным фундамэнце, і першым камнем гэтага фундамэнту павінна быць *беларуская культурна–нацыянальная работа.*

## Резолюция Белорусской Рады 26.V.1918

Поддерживая всеми своими силами акцию Рады Белорусской Народной Республики, стремящейся к созданию Белорусского независимого государства, Белорусская Рада в Вильне — до разрешения вопроса о пересмотре Брестского даговора — считает необходимым вести самостоятельно политическую акцию в целях создания здесь — по сю сторону Брестской линии — зачатка своей государственности в составе Литовско–Белорусского государства, обеспечения западных этнографических границ и защиты прав белорусского народа в пределах Белорусско–Литовской оккупации[1].

## Перад разьвязкай польскае справы

Хаця нацыянальны шавінізм звычайна называюць сьляпым, аднак тыя, хто ў нашым краю падбіваў так званых „палякаў“ на шалёную, дзікую барацьбу з усімі праявамі беларушчыны, бачылі вельмі добра мэту, дзеля каторай заніmаліся сяўбой нацыянальнай нянавісьці паміж сынамі аднэй зямлі, адны з каторых адракліся роднае маткі, а другія шануюць і любяць усей душой сваё роднае, беларускае. Апалячваньне беларусаў, цкаваньне беларускімі рэнэгатамі і адступнікамі народу беларускага, жаданьне прыдаць нашай Бацькаўшчыне „польскі характар“ — усё гэта была толькі частка шырокай палітычнай праграмы, якая кіравалася да прылучэньня Беларусі да Польшчы. І калі можа быць гутарка аб сьлепаце кіраўнікоў польскай нацыяналістычнай палітыкі ў нашым краю, дык яна была хіба ў дзіўной, ні на чым не абапёртай веры, быццам Нямеччына і Аўстрыя б’юцца дзеля таго, каб зрабіць палякам падарунак у Беларускіх землях!..

Хоць іначай, як шалёнай, гэнае думкі назваць нельга, аднак яна становіць усю „палітычную мудрасьць“ палякаў у нашым краю. І пакуль яна ня ўступіць месца якой–колечы новай, больш разумнай палітычнай ідэі, датуль палякі ў Беларусі будуць непрымірымымі ворагамі беларусаў і іх жаданьня здабыць незалежны быт.